# Кніжная выстава ў рамках Дзён культуры Татарстана адкрылася ў Мінску

13.09.2023 09:07 | Аўтар: Віктар Іванчыкаў | Без рубрыкі

**12 жніўня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася кніжная выстава «Рэспубліка Татарстан: кнігі ў культурнай прасторы», на якой былі прадстаўлены выданні, перададзеныя ў дар Нацыянальнай бібліятэкай Рэспублікі Татарстан.**




Мерапрыемства адбылося ў рамках Дзён культуры Рэспублікі Татарстан у Беларусі.

У цырымоніі прынялі ўдзел міністры культуры Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Татарстан Анатоль Маркевіч і Ірада Аюпава, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Татарстан Мадзіна Цімерзянава, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін.

«Мы шчыра рады сустракаць Дні культуры Рэспублікі Татарстан на гасціннай беларускай зямлі, глыбока ўпэўнены, што ваша знаходжанне ў нашай краіне будзе суправаджацца пазітыўным настроем і выніковай працай», — адзначыў у сваім выступленні Анатоль Маркевіч.










Выстава будзе працаваць да 24 верасня.


































**Віктар ІВАНЧЫКАЎ**

**Фота аўтара**